ХАТЫНЬ






Беларусь


У квецені і ў замеці

Над нівамі, над рэкамі


Гучы, як сведка памяці,

Званоў Хатыні рэквіем!





ХАТЫНЬ





Бясконцы паток машын цячэ і цячэ па Лагойскай шашы. На 54-ым кіламетры, там, дзе прама з лесу на ўскрай дарогі выступаюць вялікія драўляныя літары, што складаюць усім вядомае слова — «Хатынь», асфальтавая стужка робіць адгалінаванне. Той, каму трэба ехаць далей па шашы, абавязкова прыпыніцца на хвіліну, каб зняць шапку і аддаць даніну журботнай пашаны ахвярам фашызму. Але большасць паварочвае ўправа, на мемарыяльную дарогу, дзе адлік кіламетрам зроблен не звычайнымі слупамі, а надмагільнымі плітамі. Першая, другая... пятая...

Глухнуць маторы, абрываецца гамонка. Тут усе будзённыя клопаты кудысьці адступаюць, тут пачынаецца гісторыя. Кавалак гісторыі беларускага народа перыяду Вялікай Айчыннай вайны — з яго трагедыяй і з веліччу яго духу.

...Тужлівая цішыня. Яна ўвабрала ў сябе і гул шалёнага агню, і надрыўны плач дзяцей, і страшэнны крык маці, і гнеўныя праклёны закатаваных мужчын, і віскатлівы захлёб аўтаматаў, і стогны паміраючых ад куль. Увабрала смутак і журбу загінуўшых, як суровы напамінак нашчадкам: «Людзі, беражыце жыццё, засланіце сонца ад свінцовых хмар, блакітнае неба ад гару страшэнных пажарышчаў, урадлівыя нівы ад спусташэння Малохам вайны і ніколі-ніколі больш не дапусціце такое!»

І раптам — у гэтай цішыні чуецца прыглушаны ўдар звона. Яму ўторыць другі, трэці, чацвёрты... І вось ужо гудзе званамі зямля з усіх бакоў. А потым зноў — тужлівая цішыня.

Хатынь...

Назва гэтай беларускай вёскі значылася некалі толькі на картах-дзесяцівёрстках і, акрамя жыхароў суседніх паселішчаў, мала каму была вядома. Жылі тут звычайныя беларускія сяляне, аралі зямлю і сена касілі, вырошчвалі хлеб і бульбу, гулялі вяселлі і дзяцей гадавалі. Як і ўвесь беларускі народ, хатынцы ўсім сэрцам адгукнуліся на рэха залпаў «Аўроры», са зброяй у руках адстойвалі Савецкую ўладу, а потым пачалі жыццё новае ладзіць. У 1930 годзе ў калгас аб'ядналіся. І зажылі як мае быць. Калектыўна. Мелі штодня хлеб і скварку, а на свята і чарку, хаты новыя будавалі — светлыя і звонкія, дзяцей вучылі, самі розуму набіраліся. Адным словам,— жылі, як усе савецкія людзі.

Ды насунулася раптам з захаду змрочная хмара. Пачалася вайна. І апынуліся хатынцы на акупіраванай фашыстамі зямлі. Толькі не скарыліся людзі, не пажадалі лізаць боты захопнікам. У вёску часта прыходзілі партызаны — і дзяліліся з імі хатынцы апошнім кавалкам хлеба, дробачкай солі, апраналі народных заступнікаў, абувалі. Здаралася, і параненых даглядалі, лячылі, на ногі ставілі. Зноў жа — як усе сумленныя савецкія людзі.

Як усе! Таму і доля ім была наканавана фашысцкімі вылюдкамі, як і ўсім беларусам, як усім савецкім людзям. І зведалі б такую горкую, смяротную долю ўсе, калі б Камуністычная партыя не ўзняла народ на Вялікую Айчынную вайну, не выпеставала магутную Савецкую Армію, якая прынесла

паратунак і ачышчэнне ад фашысцкай погані не толькі савецкім людзям, а і ўсяму свету. Прыйшло свята на зямлю Беларусі, вярнулася воля разам з роднай Савецкай Арміяй. Ды не маглі ўжо спазнаць гэтай светлай волі хатынцы. Вёска была сцёрта з зямлі. І няма сёння назвы Хатынь нават на картах-дзесяцівёрстках. Няма. Але само гэтае слова стукае попелам у сэрцы мільёнаў людзей. Хатынь стала ў шэраг галоўных абвінаваўцаў фашызму, чалавеканенавісніцтва і вайны.

Трагедыя адбылася 22 сакавіка 1943 года. Атрад карнікаў акружыў вёску, што мірна стаяла ў лагчыне паміж пясчаных выдмаў, у акаймаванні задуменнага бору. З хат выгналі ўсіх — малых, старых і жанчын. Прыкладамі ўзнімалі з ложкаў хворых. Не шкадавалі маці з немаўлятамі на руках. Людзі сэрцам адчулі — рыхтуецца нешта страшэннае, бесчалавечнае. Адчулі, але яшчэ спадзяваліся на цуд, на паратунак, на літасць. Толькі якой літасці можна было чакаць ад катаў, ад звяроў у чалавечым абліччы — ад фашыстаў? Яны ўжо вынеслі хатынцам смяротны прыгавор. За тое, што яны беларусы, за тое, што хацелі жыць на сваёй роднай Бацькаўшчыне без фашысцкага «новага парадку», за тое, урэшце, што ў іх былі натруджаныя сялянскія рукі і сэрцы сумленных савецкіх людзей.

Адрыну, у якую сагналі хатынцаў, абклалі саломай і падпалілі. А тых, хто, нібы палаючы факел, вырываўся з агню, расстрэльвалі ва ўпор. 149 чалавек, з іх 76 дзяцей, палегла ў гэтай жудаснай брацкай магіле.

Дзве дзяўчынкі з сем'яў Клімовічаў і Федаровічаў выпадкова ўратаваліся і дапаўзлі па шэраму веснавому снегу да лесу. Абпаленых, ледзь жывых, падабралі і прытулілі іх жыхары вёскі Хварасцені. Але і тут паўтарылася трагедыя Хатыні. Галаварэзы змрочнага фашысцкага ката Дзірлевангера, якія гойсалі па Беларусі, спалілі і гэтую вёску разам з людзьмі, а дзяцей пакідалі ў студню.

З усіх хатынскіх дзяцей, што трапілі ў адрыну, толькі Віктар Жалабковіч і Антон Бараноўскі засталіся жывыя. Мінуўшы ланцуг карнікаў, яны знайшлі прытулак у партызанскім лесе. Ды Саша Жалабковіч, Валодзя і Соня Яскевічы ўратаваліся ад куль фашыстаў яшчэ калі тыя акружалі вёску.

А з дарослых жыхароў Хатыні застаўся адзін. Ён часта прыходзіць на папялішча. Зняўшы шапку, павольнай, цяжкай хадой крочыць ён да месца колішняга падворка, туды, дзе некалі гулялі яго дзеці, дзе была яго хата і веснічкі, што выпусцілі яго сям'ю ў апошні шлях. Падыходзіць і моўчкі стаіць, гаротна схіліўшы галаву. Іосіф Іосіфавіч Камінскі цудам выкараскаўся ў тую сакавіцкую раніцу з палаючай адрыны да паміраючага, прашытага фашысцкімі кулямі сына.

Астатнія загінулі ў агні. Загінулі, але не скарыліся. І як сімвал няскоранага савецкага чалавека, у цэнтры Хатынскага мемарыяла ўзнялася постаць мужчыны ў расхрыстанай абгарэлай кашулі з мёртвым дзіцем на руках. Ён глядзіць удалячынь, і яго адкінутыя ветрам валасы нагадваюць

шэрую пасму дыму. Скульптура стаіць непадалёку ад таго месца, дзе жывымі гарэлі хатынцы і дзе цяпер укладзены пліты з чорнага мармуру, што нагадваюць абвалены страху, у якой зеўрае вогненны пралом. Стаіць як гнеў і боль беларускага народа па расстраляных і спаленых, павешаных і закатаваных сынах і дочках.

26 двароў было ў вёсцы Хатынь. Усе 26 паглынуў агонь. І пасля таго як заняўся світанак вызвалення над беларускай зямлёй, не прыйшлі на хатынскія папялішчы муляры і цеслі. Некаму было прыйсці. Дзяды і бацькі, дзеці і ўнукі — усе ляжаць тут, у абпаленай, знявечанай зямлі.

Але ў памяці народнай свята жывуць героі і ахвяры Айчыннай вайны. Вялікія былі страты: загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі. І жывыя пакляліся ўвекавечыць імёны ўсіх змагароў з фашысцкай нечысцю, усіх ахвяр гітлераўскага нашэсця. Помнікі, абеліскі, памятныя курганы ўзняліся па ўсёй Беларусі. І сярод іх — мемарыяльны комплекс «Хатынь». Архітэктары Юрый Градаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін, скульптар Сяргей Селіханаў і галоўны інжынер праекта Васіль Макарэвіч суровай мовай каменя і бронзы напісалі хатынскую трагедыю.

Цяпер на месцы кожнага дворышча чарнеюць закурodымленым каменем ніжнія вянкі зрубаў. А над імі, як коміны на папялішчах, узвышаюцца стэлы, увенчаныя званамі. І голас іх рэквіемам плыве над палямі і лясамі, спраўляючы вечную трызну па тых, чые імёны запісаны на гэтых помніках.

Мемарыял «Хатынь» стаў месцам увекавечання памяці ўсіх ахвяр фашызму, усіх савецкіх людзей, загінуўшых на беларускай зямлі. Больш як дзевяць тысяч вёсак Беларусі згарэла ў прагным жарале вайны, а жыхары многіх з іх падзялілі лёс хатынцаў. Урны з зямлёй гэтых вогненных брацкіх магіл умураваны тут у каменныя пліты. Непадалёку велічна ўзвышаецца каменная сцяна — помнік вязням Трасцянца, Масюкоўшчыны і іншых канцлагераў смерці. Ніхто не забыты, нішто не забыта.

5 ліпеня 1969 года, у дні, калі ўрачыста адзначалася 25-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адбылося адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Хатынь», створанага згодна рашэння Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і ўрада рэспублікі. У гэты дзень сюды прыбылі дэлегацыі з Мінска і абласці, з раёнаў і гарадоў рэспублікі, дзесяткі тысяч працоўных, прадстаўнікі брацкіх рэспублік. І ўсе яны прынялі ўдзел ва ўрачыста-жалобным мітынгу. А потым пад схіленымі бярозамі ўспыхнула трапяткое полымя, запаленае ад Вечнага агню з плошчы Перамогі ў Мінску. Урачыстае адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Хатынь» адбылося.

І цячэ сюды бясконцая плынь людзей. Цячэ і будзе цячы, каб пакланіцца памяці загінуўшых і даць клятву ў імя жывых і наступных пакаленняў, клятву ў тым, што ні Хатынь, ні Трасцянец больш ніколі не паўторацца.





По Логойскому шоссе течет и течет бесконечный поток машин. На 54-м километре, там, где прямо из леса на обочину дороги выступают огромные деревянные буквы, из которых складывается всем известное слово — «Хатынь», асфальтированная лента разветвляется. Тот, кому нужно ехать по шоссе дальше, обязательно остановится на минуту, чтобы снять шапку и отдать дань глубочайшего почтения жертвам фашизма. Однако большинство сворачивает направо, на мемориальную дорогу, где отсчет километрам ведется не обычными столбами, а надмогильными плитами. Первая, вторая... пятая...

Глохнут моторы, обрываются разговоры. Здесь все будничные хлопоты куда-то отступают, здесь начинается история. Отрезок истории белорусского народа периода Великой Отечественной войны — с его трагедией и с величием его духа.

...Скорбная тишина. Она годами хранит и гул яростного огня, и надрывный плач детей, и отчаянный крик матерей, и гневные проклятия замученных мужчин, и визгливый захлеб автоматов, и стоны умирающих от пуль. Хранит печаль и тоску погибших, как суровое напоминание потомкам: «Люди, берегите жизнь, заслоните солнце от свинцовых туч, голубое небо от гари страшных пожарищ, плодородные нивы от опустошения Молохом войны и никогда-никогда больше не допустите такого!»

И вдруг — в этой тишине раздается приглушенный удар колокола. Ему вторит другой, третий, четвертый... И вот уже гудит колоколами земля со всех сторон. А потом снова — тревожная тишина.

Хатынь...

Название этой белорусской деревни значилось когда-то только на картах-десятиверстках и, кроме жителей соседних селений, мало кому было известно. Жили здесь обычные белорусские крестьяне, пахали землю и сено косили, выращивали хлеб и картофель, справляли свадьбы и воспитывали детей. Как весь белорусский народ, хатынцы всем сердцем откликнулись на эхо залпов «Авроры», с оружием в руках отстаивали Советскую власть, а потом начали строить новую жизнь. В 1930 году в колхоз объединились. И зажили по-настоящему. Коллективно. Хлеб и сало каждый день имели, а в праздник и чарку, дома новые ставили — светлые и звонкие, детей учили, и сами ума-разума набирались. Одним словом,— жили, как все советские люди.

Да надвинулась вдруг с запада черная туча. Началась война. И оказались хатынцы на оккупированной фашистами земле. Но не смирились люди, не захотели лизать сапоги захватчикам. В деревню часто приходили партизаны — и делились с ними хатынцы последним куском хлеба, крупинкой соли, одевали народных заступников, обували как могли. Случалось, и за ранеными ухаживали, лечили, на ноги ставили. И опять — как все честные советские люди. Как все! Потому и доля уготована им была фашистскими извергами, как и всем белорусам, как всем советским людям. Конечно, испытали бы такую горькую, смертельную долю все, если бы Коммунистическая партия не подняла народ на Великую Отечественную войну, не выпестовала

могущественную Советскую Армию, принесшую спасение и освобождение от фашистской погани не только советским людям, но и всему миру. Пришел праздник на белорусскую землю, вернулась свобода вместе с родной Советской Армией. Но не могли уже испить этой светлой воли хатынцы. Деревня была стерта с лица земли. И сегодня даже на картах-десятиверстках нет названия Хатынь. Нет. Но само это слово пеплом стучит в сердца миллионов людей. Хатынь стала в ряд главных обвинителей фашизма, человеконенавистничества и войны.

Трагедия произошла 22 марта 1943 года. Отряд карателей окружил деревню, что мирно стояла в низине между песчаных холмов, в окружении задумчивого бора. Из хат выгнали всех — детей, стариков и женщин. Прикладами поднимали с постелей больных. Не щадили и матерей с младенцами на руках. Люди сердцем чувствовали — готовится что-то страшное, бесчеловечное. Почувствовали, но еще надеялись на чудо, на спасение, на милосердие. Только какой пощады можно было ждать от палачей, от зверей в человеческом образе — от фашистов? Они уже вынесли хатынцам смертный приговор. За то, что они белорусы, за то, что хотели жить в своем родном Отечестве без фашистского «нового порядка», за то, наконец, что у них были натруженные крестьянские руки и сердца честных советских людей.

Сарай, в который согнали хатынцев, обложили соломой и подожгли. А тех, кто пылающим факелом вырывался из огня, расстреливали в упор. 149 человек, из них 76 детей, легло в этой жуткой братской могиле.

Две девочки из семей Климовичей и Федоровичей случайно спаслись и доползли по серому весеннему снегу к лесу. Обожженных, еле живых, их подобрали и приютили жители деревни Хворостени. Однако и здесь повторилась трагедия Хатыни. Головорезы мрачного фашистского палача Дирлевангера, свирепствовавшие в Белоруссии, сожгли и эту деревню вместе с людьми, а детей побросали в колодец.

Из всех хатынских детей, что оказались в сарае, только Виктор Желобкович и Антон Барановский остались живыми. Обойдя цепь карателей, они нашли спасение в партизанском лесу. Да Саша Желобкович, Володя и Соня Яскевичи спаслись от фашистских пуль еще в то время, когда изверги окружали деревню.

А из взрослых жителей Хатыни остался один. Он часто приходит на пепелище. Сняв шапку, медленными, тяжелыми шагами идет к месту своего бывшего подворья, туда, где играли когда-то его дети, где была его хата и калитка, что выпустила родную семью в последний путь. Подходит и молча стоит, печально склонив голову. Иосиф Иосифович Каминский чудом выкарабкался в то мартовское утро из-под обломков пылающего сарая к умирающему, прошитому фашистскими пулями сыну.

Остальные погибли в огне. Погибли, но не покорились. И как символ непокоренного советского человека, в центре Хатынского мемориала поднялась фигура мужчины в расстегнутой обгоревшей рубашке с мертвым ребенком на руках. Он

смотрит вдаль, и его разметанные ветром волосы похожи на серый клок дыма. Скульптура стоит недалеко от того места, где живыми горели хатынцы и где теперь уложены плиты из черного мрамора, напоминающие рухнувшую крышу, с зияющим огненным проломом. Стоит как гнев и боль белорусского народа по расстрелянным и сожженным, повешенным и замученным сыновьям и дочерям.

26 дворов было в деревне Хатынь. Все 26 поглотил огонь. И после того как занялась заря освобождения над белорусской землей, не пришли на пепелища каменщики и плотники. Некому было прийти. Деды и отцы, сыновья и внуки — все лежат здесь, в обожженной, изувеченной земле.

Но в памяти народной свято живут герои и жертвы Отечественной войны. Велики были потери: погиб каждый четвертый житель республики. И живые поклялись увековечить имена всех борцов с фашистской нечистью, всех жертв гитлеровского нашествия. Памятники, обелиски, памятные курганы поднялись по всей Белоруссии. И среди них — мемориальный комплекс «Хатынь». Архитекторы Юрий Градов, Валентин Занкович, Леонид Левин, скульптор Сергей Селиханов и главный инженер проекта Василий Макаревич суровым языком камня и бронзы написали хатынскую трагедию.

Сейчас на месте каждого подворья чернеют закуренным камнем нижние венцы срубов. А над ними, как печные трубы на пепелищах, возвышаются стелы, увенчанные колоколами. И голос их реквиемом плывет над полями и лесами, справляя вечную тризну по тем, чьи имена записаны на этих памятниках.

Мемориал «Хатынь» стал местом увековечения памяти всех жертв фашизма, всех советских людей, погибших на белорусской земле. Более девяти тысяч деревень сгорело в ненасытном жерле войны, и многие их жители разделили судьбу хатынцев. Урны с землей этих огненных братских могил вмурованы здесь в каменные плиты. А рядом возвышается каменная стена — памятник узникам Тростенца, Масюковщины и других концлагерей смерти. Никто не забыт, ничто не забыто.

5 июля 1969 года, в дни, когда торжественно отмечалось 25-летие освобождения Белоруссии от немецко-фашистских захватчиков, состоялось открытие мемориального комплекса «Хатынь», созданного по решению Центрального Комитета Коммунистической партии Белоруссии и правительства республики. В этот день сюда прибыли делегации из Минска и области, из районов и городов республики, десятки тысяч трудящихся, представители братских республик. И все они приняли участие в торжественно-траурном митинге. А потом под склоненными березами вспыхнуло трепетное пламя, зажженное от Вечного огня с площади Победы в Минске. Торжественное открытие мемориального комплекса «Хатынь» состоялось.

И течет сюда бесконечный поток людей. Течет и будет течь, чтобы поклониться памяти погибших и дать клятву во имя живых и будущих поколений, клятву в том, что ни Хатынь, ни Тростенец больше никогда не повторятся.




СЛУШАЙТЕ, ЛЮДИ! К ВАШИМ СЕРДЦАМ ОБРАЩАЮТСЯ
КОЛОКОЛА ХАТЫНИ. С ГНЕВОМ И БОЛЬЮ РАССКАЗЫВАЮТ
ОНИ О ТРАГЕДИИ ЭТОЙ ДЕРЕВНИ. 22 МАРТА 1943 ГОДА
ОТРЯД ФАШИСТСКИХ ЗАХВАТЧИКОВ ОКРУЖИЛ ДЕРЕВНЮ.
ВСЕ ЖИТЕЛИ - СТАРИКИ, ЖЕНЩИНЫ, ДЕТИ - БЫЛИ СОГНАНЫ
В САРАЙ И ЗАЖИВО СОЖЖЕНЫ.
ФАШИСТСКИЕ ВАРВАРЫ ПРЕВРАТИЛИ В РУИНЫ 209
БЕЛОРУССКИХ ГОРОДОВ И ГОРОДСКИХ ПОСЕЛКОВ, 9200
СЕЛ И ДЕРЕВЕНЬ. В СОТНЯХ ИЗ НИХ БЫЛИ УНИЧТОЖЕНЫ
МИРНЫЕ ЖИТЕЛИ. ОТ РУК ОККУПАНТОВ В БЕЛОРУССИИ
ПАЛО 2 МИЛЛИОНА 230 ТЫСЯЧ СОВЕТСКИХ ГРАЖДАН.
ЭТО НИКОГДА НЕ БУДЕТ ЗАБЫТО!









Свяшчэннае полымя, запаленае ад Вечнага агню з плошчы Перамогі ў Мінску, дастаўлена ў Хатынь.

Священное пламя, зажженное от Вечного огня с площади Победы в Минске, доставлено в Хатынь.





Урачыста-жалобны мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

Торжественно-траурный митинг, посвященный открытию мемориального комплекса «Хатынь».






ХАТЫНЬ НЕ АДНА
136 ВЕСАК З ЛЮДЗЬМІ
НА НАШАЙ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ
136
136 ДЕРЕВЕНЬ



Як гнеў і боль беларускага народа, як напамін нашчадкам аб ахвярах вайны, будзе вечна стаяць гэты помнік на шматпакутнай абпаленай зямлі.

Как гнев и боль белорусского народа, как напоминание потомкам о жертвах войны, будет вечно стоять этот памятник на многострадальной опаленной земле.


МІНСК
ШЫРОКАЯ ВУЛІЦА
У КАНЦЛАГЕРЫ
ЗНІШЧАНА










Помнік вязням Трасцянца, Масюкоўшчыны і іншых лагераў смерці.

Памятник узникам Тростенца, Масюковщины и других лагерей смерти.



Званіце, званы, у Хатыні,
Зганяйце санлівую стынь:
Хай голас народнай святыні
Кране ўсіх краін далячынь.

Будзіце сумленне няспынна,
Штурхайце злачынцаў на суд,
Ад імя мільёнаў нявінных
Выносьце суровы прысуд.





Кветкі жывыя не вянуць ля агню.

Не вянут живые цветы у огня.







І. І. Камінскі, які цудам вырваўся з вогненнага пекла, заклікае сучаснікаў, моладзь: «Дарагія мае, не дапусціце больш такога!»

И. И. Каминский, чудом вырвавшийся из огненного пекла, заклинает современников, молодежь: «Дорогие мои, не допустите больше такого!»









Усе родныя і блізкія А. П. Жалабковіча, чалавека, якому ўдалося ў той жудасны сакавіцкі дзень уратавацца ад карнікаў, ляжаць тут, у хатынскай зямлі.

Все родные и близкие А. П. Желобковича, человека, которому удалось в тот страшный мартовский день спастись от карателей, лежат здесь, в хатынской земле.







Ідуць і ідуць сюды людзі, ідуць, каб пакланіцца памяці беларускіх паселішчаў, што падзялілі лёс Хатыні.


Идут и идут сюда люди, идут, чтобы поклониться памяти белорусских селений, что разделили участь Хатыни.











ДРАЖЫНСКАЯ ЮЗЭФА АНТОНАЎНА
ДРАЖЫНСКАЯ ВАЛЯ 10 год
ДРАЖЫНСКАЯ НІНА 5 год
ДОЎГЕЛЬ АНТОН АНТОНАВІЧ
ДОЎГЕЛЬ ВЕРА 10 год


ЮТКА КАЗІМІР ФЕЛІКСАВІЧ
ЮТКА АЛЕНА СЦЯПАНАЎНА
ЮТКА МАРЫЯ
ЮТКА АЛЬБЕРТ 15 год
ЮТКА СТАСЯ 12 год
ЮТКА ДАМІНІК 7 год
ЮТКА РЭНА 6 год
ЮТКА СЦЕЛА 4 гады
ЮТКА ЮЗІК 2 гады
НАВІЦКІ АЛЯКСАНДР РАМАНАВІЧ
НАВІЦКАЯ АЛЯКСАНДРА
НАВІЦКІ ЛЕНА
НАВІЦКІ ЖЕНЯ
НАВІЦКАЯ МАНЯ
НАВІЦКАЯ АНЯ
НАВІЦКІ КОСЦЯ
НАВІЦКІ АНТОСЬ
НАВІЦКІ МІША



Звaніце, званы, у Хатыні,
Зганяйце санлівую стынь:
Хай голас народнай святыні
Кране ўсіх краін далячынь.

Званіце трывожна, балюча
Ад спаленых сэрцаў і хат,
Ад тых, каго дротам калючым
Вязаў перад допытам кат.











ЖАЛАБКОВІЧ ІВАН ІВАНАВІЧ
ЖАЛАБКОВІЧ СОФІЯ АНТОНАЎНА
ЖАЛАБКОВІЧ МАРЫЯ
ЖАЛАБКОВІЧ УЛАДЗІМІР
ЖАЛАБКОВІЧ ЛЕНА 12 год
ЖАЛАБКОВІЧ ЛЕНА 4 гады
ЖАЛАБКОВІЧ МІША 2 гады
ЯСКЕВІЧ ІВАН АНТОНАВІЧ
ЯСКЕВІЧ ЮЛІЯ ІВАНАЎНА
ЯСКЕВІЧ БОНЯ 10 год
ЯСКЕВІЧ ЛЕНА 8 год
ЯСКЕВІЧ АНА 4 гады
ЯСКЕВІЧ МІША 2 гады














ТРАСЦЯНЕЦ
У ЛАГЕРЫ СМЕРЦІ
ЗНІШЧАНА
206500 ЧАЛАВЕК





Ніхто не забыты, нішто не забыта.

Никто не забыт, ничто не забыто.



Званіце, званы, у Хатыні,
Зганяйце саплівую стынь:
Хай голас народнай святыні
Кране ўсіх краін далячынь.

Званіце балюча, няспынна,
Званіце ад веку у век,
Каб з попелу сэрцы нявінных
Пачуў, зразумеў чалавек.











Гэтая сцежка не зарасце ніколі.

Эта тропа не зарастет никогда.







ХАТЫНЬ

На белорусском и русском языках

Фатаграфіі А. і М. Ананьіных. Тэкст Б. Стральцова. Эпіграф А. Вялюгіна. Вершы С. Шушкевіча. Мастакі У. і М. Басалыгі.

Рэдактар І. Крымава. Мастацкія рэдактары У. Круглоў і В. Курусь. Карэктар Л. Тавачэнка.

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ». МІНСК, 1970 г.

АТ 26171. Здадзена ў набор 30/X 1969 г. Падп. да друку 27/III 1970 г. Тыраж 335 000 экз. Фармат 70×84 1/16. Папера для глыб. друку. Фіз. друк. арк. 4. Ум. друк. арк. 4,08. Уч.-выд. арк. 5,4. Зак. 564. Цана 57 кап.

Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Мінск, Ленінскі пр., 79.

$\frac{2\text{-}8\text{-}4}{420\text{-}431\text{-}70}$



57 к.

